

# МУЗЕЯЗНАЎСТВА

*І. І. БАМБЕШКА, А. Я. ПАЎЛАВА*

## ПЫТАННІ НАВУКОВА-ФОНДАВАЙ РАБОТЫ НАЦЫЯНАЛЬНАГА МАСТАЦКАГА МУЗЕЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ У 1944–1984 гг.

*Аўтары артыкула звяртаюцца да вывучэння архіўных крыніц аб дзейнасці адной з вядучых музейных устаноў краіны – Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь. Выбар тэмы абумоўлены недастаткова глыбокім асэнсаваннем у навуковых работах айчынных даследчыкаў як архівістаў, так і музеязнаўцаў, крыніцазнаўчай базы па гісторыі музейных устаноў Беларусі. Даследчыцы дэталёва разглядаюць працэс фарміравання музеязнаўчай дзелавой дакументацыі на прыкладзе комплексу матэрыялаў Дзяржаўнага мастацкага музея БССР. Вызначаюцца ступень сапраўднасці, рэпрэзентатыўнасці прыгаданых крыніц, асаблівасці стварэння і афармлення асобных відаў дакументацыі.*

У Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва (БДАМЛМ) захоўваюцца дакументы справаводнага характару, прысвечаныя дзейнасці Дзяржаўнага мастацкага музея ў перыяд з 1944 па 1984 г. Гэтыя дакументы аб’яднаны ў 164 фонд, які атрымаў і адпаведную назву – «Дзяржаўны мастацкі музей БССР». У акрэслены перыяд музей двойчы змяніў назву: з 1939 па 1957 г. – Дзяржаўная карцінная галерэя БССР (ДКГ БССР), а з 1957 па 1993 г. – Дзяржаўны мастацкі музей БССР (ДММ БССР). Дакументы названага фонду з’яўляюцца практычна невывучанымі, адзінае выключэнне – артыкул дырэктара названага архіва Г. В. Запартыкі, у якім даецца агульны агляд матэрыялаў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь (НММ РБ) у фондах архіва [40].

Навукова-фондавая работа – адзін з вядучых напрамкаў дзейнасці музея, які ўключае камплектаванне, улік, захаванне і вывучэнне аб’ектаў спадчыны [42]. Найбольш падрабязна інфармацыя аб навукова-фондавай рабоце ДКГ БССР прадстаўлена ў пастановах і загадах Упраўлення (з 1949 г. – Камітэта) па справах мастацтваў пры СНК (з сакавіка 1946 г. – Савета міністраў) СССР і БССР, з 1953 г. – Міністэрства культуры БССР (МК БССР), перапісцы са згаданымі ўстановамі, планах і справаздачах музея і яго супрацоўнікаў і г. д.

На любым этапе развіцця музея адной з галоўных задач яго дзейнасці з’ўляецца камплектаванне музейных фондаў. Дакументы БДАМЛМ даваляюць вызначыць асноўныя формы і шляхі папаўнення фондаў галерэі. Першаснымі задачамі галерэі ў гады пасля аднаўлення сталі вяртанне вывезеных нямецка-фашысцкімі захопнікамі гісторыка-культурных каштоўнасцей, кампенсацыі знішчанай маёмасці за кошт прадметаў і абсталяван-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ня мастацкіх музеяў Германіі і рээвакуацыя належачых галерэі твораў мастацтва [1, арк. 2; 2, арк. 63; 3, арк. 3; 4, арк. 2, 6; 25, арк. 9].

Таксама ў адным з лістоў на адрас СНК БССР дырэктар галерэі настойвала на выданні спецыяльнага загаду аб вяртанні асобнымі ўстановамі і прыватнымі асобамі твораў з даваеннай калекцыі ДКГ [11, арк. 7].

Фонды галерэі папаўняліся і за кошт закупак твораў мастацтва за ўласныя сродкі, якіх пастаянна не хапала. Ужо з ліпеня 1944 г. Наркамфін БССР зацвердзіў каштарыс выдаткаў галерэі, за выключэннем сродкаў на закупку прадметаў музейнага значэння, якія збіраўся пераводзіць галерэі па меры прадастаўлення рахункаў. Па меркаванні супрацоўнікаў галерэі, такая сістэма фінансавання была вельмі нязручная, паколькі абмяжоўвала дзейнасць, а ў асобных выпадках цалкам пазбаўляла магчымасці набыцця неабходных прадметаў [5; 6]. Таму ДКГ БССР прасіла СНК БССР, а затым і МК разгледзець і зацвердзіць каштарыс выдаткаў галерэі у цэлым, а таксама выдзеліць для галерэі сродкі на набыццё прадметаў з рэспубліканскага бюджэту па прыкладзе іншых рэспублік [5, арк. 3; 11, арк. 7]. На працягу вывучаемага перыяду кіраўніцтва Упраўлення па справах мастацтваў, а затым МК БССР неаднаразова нагадвала дырэктару музея аб неабходнасці фінансавай дысцыпліны ў працэсе камплектавання, паколькі А. В. Аладава, заклапочаная неабходнасцю і жаданнем папаўняць калекцыі музея, не заўважала перарасход сродкаў [6, арк. 1–12].

Дакументы адлюстроўваюць першыя крокі музея па аднаўленні ў другой палове 1940-х гг. аддзелаў беларускага і рускага мастацтва (XVIII – пачатку XX ст.) і савецкага мастацтва, без якіх галерэя існаваць не магла [7, арк. 5].

Акрамя твораў жывапісу музей набываў эстампы і рэпрадукцыі твораў рускага і савецкага мастацтва. Трэба адзначыць, што на працягу многіх гадоў прыярытэтным для ДММ было папаўненне калекцый рускага і беларускага мастацтва. З гэтай нагоды музей аднойчы нават адмовіўся набыць калекцыю кітайскага прыкладнога мастацтва [30, арк. 53]. Усе творы мастацтва для музея ў 1944–1947 гг. набываліся праз закупачныя камісіі Камітэта па справах мастацтваў пры СНК СССР у Маскве і Ленінградзе, а таксама праз аналагічную ўстанову пры Упраўленні па справах мастацтваў пры СНК БССР [3, арк. 4; 5, арк. 1–6]. А. В. Аладава рабіла экспертызу ўсіх твораў выяўленчага мастацтва, якія паступалі для музея па ўрадавых каналах і часова захоўваліся на базе Белгалоўснаба [5, арк. 26].

Крыніцамі папаўнення за сродкі музея былі, у першую чаргу, калекцыянеры, з якімі музей падтрымліваў цесныя сувязі і дзякуючы якім мог папаўняцца творамі майстроў былых эпох [29, арк. 5–7, 15–17, 24, 32, 34]. Так, у справаздачы за 1966 г. адзначалася, што праз Экспертна-закупачную камісію ў прыватных калекцыянераў было набыта 128 прадметаў музейнага значэння [21, арк. 1–19]. Таксама здатчыкамі выступалі аматары мастацтва, сваякі і нашчадкі мастакоў і іншыя асобы.

Камплектаванне ДКГ адбывалася і за кошт перадачы твораў мастацтва з балансу Упраўлення па справах мастацтваў БССР і іншых структур, за кошт перадачы з абменнага фонду МК СССР і абмену паміж музеямі [13, арк. 6; 23, арк. 22–26; 29, арк. 24, 36]. Яшчэ адной крыніцай камплектаван-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ня сталі прадпрыемствы рэспублікі, якія выраблялі творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Так, у 1968 г. А. В. Аладава звярнулася да старшыні Экспертна-закупачнай камісіі МК БССР з просьбай прафінансаваць набыццё музеем твораў, вырабленых на шклозаводах «Нёман» і імя Ф. Дзяржынскага [23, арк. 1]. Для атрымання твораў сучасных майстроў была наладжана сувязь з Саюзам мастакоў СССР, які пасля перамоў згадзіўся сістэматычна перадаваць творы выяўленчага мастацтва ў ДММ БССР [22, арк. 31].

У камплектаванні галерэі музея ўдзельнічалі не толькі супрацоўнікі музея і кіраўніцтва рэспублікі, часта цікавыя прапановы паступалі ад калег з Масквы і Ленінграда. У якасці прыкладу можна прывесці ліст П. Я. Карнілава, загадчыка аддзела выяўленчых мастацтваў Упраўлення па справах мастацтваў пры Ленгарвыканкаме, які прапаноўваў набыць мастацкую спадчыну вучня І. Я. Рэпіна, ураджэнца Віцебшчыны, мастака Р. М. Баброўскага. Кіраўніцтва рэспублікі станоўча аднеслася да такой прапановы і вырашыла камандзіраваць у Ленінград супрацоўнікаў музея. Аднак па шэрагу прычын гэта калекцыя так і не была набыта [5, арк. 5–6; 26, арк. 29].

Адной з форм камплектавання музея з'яўляліся экспедыцыі ў розныя рэгіёны рэспублікі. Дастаткова шмат захавалася матэрыялаў пра экспедыцыі 1960–1970-х гг. Асноўнымі напрамкамі экспедыцый у азначаныя дзесяцігоддзі былі Гродзенская, Брэсцкая і заходнія раёны Віцебскай вобласці [19, арк. 10–14; 24, арк. 6; 27, арк. 11; 33, арк. 12; 35, арк. 16]. Даволі часта музей наладжваў экспедыцыі сумесна з Інстытутам мастацтвазнаўства і фальклору АН БССР, Беларускім добраахвотным таварыствам аховы помнікаў гісторыі і культуры, падчас якіх не толькі выяўлялі і адбіралі прадметы музейнага значэння, але і правяралі стан захаванасці помнікаў гісторыі і культуры, рабілі кансервацыю, вызначалі факты крадзяжу царкоўнай маёмасці і г.д. [31, арк. 16; 35, арк. 18].

Праца па павелічэнні фондаў ДММ БССР не спынялася на працягу ўсяго вывучаемага перыяду, і дакументы вывучаемага фонду гэта пацвярджаюць.

Акрамя камплектавання музейных фондаў, важным напрамкам навукова-фондавай работы любога музея з'яўляецца арганізацыя ўліку музейных фондаў, які забяспечвае юрыдычную ахову і замацоўвае кожны прадмет за пэўнай музейнай установай і музейнай калекцыяй. Дзейнасць у галіне ўліку складаецца з двух этапаў:

– першасная рэгістрацыя, якая адбываецца праз акты прыёму на пастаяннае захаванне і запіс музейных прадметаў і навукова-дапаможных матэрыялаў у адпаведныя кнігі паступлення;

– другая ступень уліку ці навуковая інвентарызацыя музейных прадметаў [43, с. 394].

Дакументы БДАМЛМ сведчаць аб тым, што пытанні ўліку ў ДКГ былі не на адпаведным узроўні. І гэта можна было зразумець, паколькі на першых этапах аднаўлення музея галоўным было аднаўленне фонду. У снежаньскім загадзе МК БССР за 1958 г. адзначалася, што работы па ўліку, кансервацыі і захаванні прадметаў знаходзяцца на нездавальняючым уз-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

роўні. Праверка выкрыла шэраг істотных парушэнняў «Інструкцыі па ўліку і захаванні музейных каштоўнасцей у мастацкіх музеях»: рэгістрацыя і ўзяцце прадметаў на інвентарны ўлік з наданнем кожнаму асабістага нумара адбывалася несвоечасова і інш. [14, арк. 25–27]. Аб стане ўліковай работы музея ў 1940–1970-я гг. сведчыць ліст да тагачаснага першага намесніка Міністра культуры БССР У. А. Гілепа дырэктара музея Ю. А. Карачуна за 1983 г., дзе апошні піша аб тым, што да стварэння МК БССР творы выяўленчага мастацтва, выкананыя беларускімі мастакамі па дамовах з Упраўленнем па справах выяўленчых мастацтваў, перадаваліся ў ДММ толькі пасля іх закупкі і аплаты. Пасля гэтага ДММ складаў акты аб стане кожнага твора, надаваў работам інвентарныя нумары. З 1959 г. па вуснай дамоўленасці з МК БССР у парушэнне інструкцыі ДММ выдаваў акты і прысвойваў інвентарныя нумары яшчэ неаплачаным і ненабытым творам [38, арк. 21]. А. В. Аладава намякала на гэта ў лістах да намесніка старшыні Прэзідыума ВС БССР і намесніка старшыні СМ БССР яшчэ раней [23, арк. 8–9].

Пачынаючы з 1960-х гг. кіраўніцтва музейнай галіны рэспублікі стала надаваць значную ўвагу інвентарызацыі (думаецца, што гэта была толькі першая ступень уліку – запіс у галоўную інвентарную кнігу). Сярод дакументаў фонду можна ўбачыць копію распараджэння МК БССР аб правядзенні на працягу 1965–1966 гг. інвентарызацыі ўсіх музейных фондаў, для чаго прадугледжвалася стварэнне спецыяльнай камісіі [18, арк. 6]. Дакументы сведчаць, што працэс інвентарызацыі прадметаў з калекцый быў актывізаваны. Пры абмеркаванні пытанняў пераінвентарызацыі на пасяджэнні Навуковай рады ў сакавіку 1967 г. кіраўнік аддзела ўліку і захавання А. І. Сакалоў заўважаў, што немагчыма ажыццявіць пераінвентарызацыю ўсіх фондаў музея адразу і рабіць гэта трэба паступова [20, арк. 9]. Тым не менш за першы квартал 1969 г. прайшоў пераінвентарызацыю 3381 прадмет, зноў заінвентарызавана 100 прадметаў, а на пастаяннае захоўванне прынята 307 адзінак [24, арк. 8].

З 1970 г. у структуры музея з’явіўся навукова-фондавы аддзел, у задачы якога і ўваходзілі пытанні ўліку музейных прадметаў і навукова-дапаможных матэрыялаў. Разам з тым дакументы сведчаць, што запіс музейных прадметаў у навуковыя інвентары рабіўся не адразу пасля праходжання першаснай інвентарызацыі. Толькі за 1974 г. з 1044 прынятых на пастаяннае захаванне і запісаных у кнігу паступленняў прадметаў было заінвентарызавана толькі 559 адзінак [24, арк. 14]. І гэта зразумела, паколькі другая ступень уліку прадугледжвае папярэдняе вывучэнне музейнага прадмета і ў навуковы інвентар (ці інвентарную кнігу калекцыі) уносіцца значна большы аб’ём інфармацыі, чым у кнігу паступленняў асноўнага фонду.

Вынікі праверкі сапраўднасці справаздачы музея за 1970 г. паказалі, што большая частка неабходнай дакументацыі адпавядала патрабаванням, хаця ў музеі адсутнічалі калекцыйныя вопісы і журнал уліку фондавых кніг [28, арк. 13]. Аднак згаданы ліст Ю. А. Карачуна сведчыць аб тым, што ва ўліковай дакументацыі музея было яшчэ шмат праблем [38, арк. 21].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У задачы аддзела навукова-фондавай работы ўваходзяць і пытанні аховы музейных прадметаў. Для ДКГ БССР у пасляваенны перыяд актуальным стала пытанне адсутнасці будынка, што знайшло адлюстраванне ў шэрагу дакументаў фонду. Паводле распараджэння № 1338 Упраўлення па справах мастацтваў за кастрычнік 1944 г. у часовае карыстанне ДКГ БССР перадаваліся 4 пакоі ў левым крыле першага паверха будынка Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны па адрасе плошча Свабоды, 41. Агульная плошча галерэі складала 344,5 м², з іх пад экспазіцыю было адведзена 300 м² [1, арк. 10; 36, арк. 7].

Адсутнасць уласнага будынка значна стрымлівала работу галерэі па ўсіх напрамках. Адны і тыя ж памяшканні выкарыстоўваліся і пад экспазіцыю, і пад кароткатэрміновыя выстаўкі, там жа адбываўся адбор прадметаў на выстаўкі па-за музеем, экспазіцыйныя залы ператвараліся ў майстэрні мастакоў і фондасховішчы, што паралізоўвала работу з аўдыторыяй. Так, у справаздачы музея за 1949 г. адзначалася, што для наведвання прадугледжвалася ўсяго 115 дзён [7, арк. 4; 11, арк. 5].

У 1949 г. Савет міністраў БССР прыняў рашэнне аб арганізацыі работ па стварэнні праектна-каштарыснай дакументацыі новага будынка для карціннай галерэі і выдзяленні неабходнага зямельнага ўчастка пад музей [9, арк. 3].

Толькі ў 1957 г. быў узведзены ўласны будынак музея. Аднак хутка стала зразумела, наяўных плошчаў недастаткова, паколькі асноўныя экспазіцыйныя плошчы, усе віды сховішчаў і дадатковыя памяшканні былі запраектаваны ў другім корпусе [41, с. 86]. У 1964 г. на пасяджэннях Навуковай рады музея актыўна абмяркоўвалася праектнае заданне на пабудову другой часткі музея [20, арк. 5]. Да 1 жніўня 1968 г. музею неабходна было прадставіць у МК БССР прапановы па перспектыўным будаўніцтве музея на наступнае дзесяцігоддзе, аднак з перапіскі музея з прыватнымі калекцыянерамі за 1970 г. становіцца зразумелым, што ДММ канчаткова адмовілі ў будаўніцтве другой чаргі музея [29].

Чатыры пакоі Дома прафсаюзаў, якія займала галерэя да 1957 г., не адпавядалі патрабаванням і па тэмпературна-вільготнасных умовах захавання. Так, сярод дакументаў за 1945 г. маецца службовая запіска А. В. Аладавай на імя кіраўніка групы культуры СНК БССР М. М. Ваганавай аб сітуацыі з захаваннем музейных каштоўнасцей у залах і фондасховішчах галерэі. Дырэктар галерэі прапаноўвала для павелічэння тэмпературы ў памяшканнях выдзеліць да 200 кубаметраў дроў [3, арк. 16].

Акрамя дрэннага тэмпературна-вільготнаснага стану, будынак на плошчы Свабоды не адпавядаў патрабаванням супрацьпажарнай бяспекі, аб чым таксама сведчаць дакументы 164 фонду [10, арк. 9]. У наступныя дзесяцігоддзі праблема супрацьпажарнай бяспекі заставалася актуальнай. З загада МК БССР ад 19.06.1968 г. становіцца вядома аб майскім пажары ў двары музея, да якога прывяло размяшчэнне там лёгкіх на загаранне адходаў вытворчасці. Акрамя таго, з прыгаданага загада вынікае, што ў будынку музея таксама не ўсе супрацьпажарныя меры выконваліся належным чынам. Дырэктару музея прадпісвалася ў кароткі тэрмін прадугледзець і правесці мерапрыемствы па выпраўленні становішча [22, арк. 35].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Што датычыцца пытанняў захаванасці твораў мастацтва падчас экспанавання ў ДММ, то кіраўніцтва музея было заклапочана тым, што падрыхтоўка і замена экспазіцый ажыццяўляліся персаналам без адпаведнай кваліфікацыі [26, арк. 7]. Таму для музейных супрацоўнікаў, пачынаючы з 1948 г., праводзіліся спецыяльныя заняткі па пытаннях захавання музейных каштоўнасцей [8, арк. 4]. У 1960 г. музей набыў спецыяльныя шафы для захоўвання графікі і паставіў матавае шкло ў экспазіцыйных залах [16, арк. 15]. Сур'ёзнай праблемай з'яўлялася перамяшчэнне твораў вялікага памеру. Пытанні ўліку і захаванасці твораў мастацтва неаднаразова абмяркоўваліся на пасяджэннях Навуковай рады музея [17, арк. 1–26].

Супрацоўнікі музея ўважліва сачылі за лёсам твораў, перададзеных у часовае карыстанне іншым музеям. У якасці прыкладу можам прывесці заклапочанасць несвоечасовым вяртаннем твораў П. А. Малявіна і А. А. Рылова пасля экспанавання ў Навукова-даследчым музеі Акадэміі мастацтваў СССР і пастаяннымі стратамі музейных прадметаў падчас правядзення выставак, арганізаваных Таварыствам дружбы і культурных сувязей з замежнымі краінамі [29; 37, арк. 6].

Калі ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе галоўнай задачай было аднаўленне фонду музея, то ў другой палове 1950-х гг. МК БССР стала надаваць больш увагі навуковай дзейнасці музейных устаноў, што было абумоўлена адыходам ад погляду на музей толькі як «палітасветкамбінат», ён зноў пачынае ўспрымацца як навуковая ўстанова.

Паводле справаздач супрацоўнікаў музея, асноўнымі напрамкамі навуковай дзейнасці ў названы перыяд былі вывучэнне рускага і беларускага выяўленчага мастацтва па жанрах і храналагічных перыядах, складанне навуковай картатэкі творцаў і твораў з фондаў ДММ БССР, падрыхтоўка альбома «Дзяржаўная карцінная галерэя БССР», праца над нарысамі «Беларускае мастацтва», напісанне артыкулаў пра ДММ БССР, знакамітых дзеячаў і жанры выяўленчага мастацтва ў газеты і часопісы рэспублікі: «Мінская праўда», «Маладосць», «Літаратура і мастацтва» і інш., распрацоўка метадычак і каталогаў да перасоўных і стацыянарных выставак, каталогаў новых паступленняў, вывучэнне музейных прадметаў, удзел у саюзных і рэспубліканскіх канферэнцыях, падрыхтоўка манаграфій па мастацтве БССР [11, арк. 9; 15, арк. 22; 32, арк. 6; 33, арк. 12; 34, арк. 31; 38, арк. 22; 39, арк. 9–15]. Знакавай падзеяй стала правядзенне ў 1966 г. навуковай канферэнцыі «Дзяржаўнаму мастацкаму музею БССР 25 гадоў» [23, арк. 5].

Такім чынам, у фондзе 164 БДАМЛМ захоўваецца рэпрэзентатыўны комплекс дакументаў, якія раскрываюць такую важную сферу дзейнасці НММ РБ, як навукова-фондавая дзейнасць: формы і крыніцы камплектавання фондаў, фарміраванне сістэмы ўліку музейных прадметаў, арганізацыя захавання музейных каштоўнасцей, наладжванне навукова-даследчай работы.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. БДАМЛМ. – Ф. 164. – Воп. 1. – Спр. 1. Пастановы, загады Камітэта па справах мастацтваў пры СНК СССР і БССР, 1944 г.

2. БДАМЛМ. – Ф. 164. – Воп. 1. – Спр. 2. Вопіс музейных каштоўнасцей, вывезеных фашысцкімі акупантамі ў Германію, 1944 г.

3. БДАМЛМ. – Фонд 164. – Воп. 1. – Спр. 5. Перапіска з СНК БССР, Галоўным упраўленнем устаноў выяўленчага мастацтва па пытаннях камплектавання Дзяржаўнай карціннай галерэі, 1944 г.

4. БДАМЛМ. – Ф. 164. – Воп. 1. – Спр. 14. Перапіска з СНК БССР і Камітэтам па справах мастацтваў па пытаннях музейных каштоўнасцей, выкрадзеных у час акупацыі, 1945 г.

5. БДАМЛМ. – Ф. 164. – Воп. 1. – Спр. 15. Перапіска з СНК БССР і Камітэтам па справах мастацтваў БССР па пытаннях камплектавання галерэі.

6. БДАМЛМ. – Ф. 164. – Воп. 1. – Спр. 16. Загады і пастановы Упраўлення па справах мастацтваў пры СМ СССР і СМ БССР.

7. БДАМЛМ. – Ф. 164. – Воп. 1. – Спр. 28. Даведка аб рабоце Дзяржаўнай карціннай галерэі БССР з моманту яе аднаўлення, 1944 г.

8. БДАМЛМ. – Ф. 164. – Воп. 1. – Спр. 31. Гадавая справаздача аб рабоце музея за 1948 г.

9. БДАМЛМ. – Ф. 164. – Воп. 1. – Спр. 36. Копіі пастаноў СНК БССР і СМ БССР аб стварэнні і аднаўленні дзейнасці Дзяржаўнай карціннай галерэі і аднаўленні будынка галерэі.

10. БДАМЛМ. – Ф. 164. – Воп. 1. – Спр. 37. Загады Упраўлення па справах мастацтваў пры СМ СССР і СМ БССР.

11. БДАМЛМ. – Ф. 164. – Воп. 1. – Спр. 38. Гадавы план і справаздача, 1949 г.

12. БДАМЛМ. – Ф. 164. – Воп. 1. – Спр. 61. Гадавы план і справаздача, 1954 г.

13. БДАМЛМ. – Ф. 164. – Воп. 1. – Спр. 65. Перапіска з Галоўным упраўленнем па справах мастацтва СССР па пытаннях дзейнасці галерэі, 1954 г.

14. БДАМЛМ. – Ф. 164. – Воп. 1. – Спр. 77. Загады і пастановы Упраўлення па справах мастацтваў пры СМ БССР, 1958 г.

15. БДАМЛМ. – Ф. 164. – Воп. 1. – Спр. 83. Гадавы план і справаздача за першае паўгоддзе 1959 г.

16. БДАМЛМ. – Ф. 164. – Воп. 1. – Спр. 89. Гадавы план на 1960 г.

17. БДАМЛМ. – Ф. 164. – Воп. 1. – Спр. 107. Пратаколы пасяджэнняў Навуковай рады за 1962 г.

18. БДАМЛМ. – Ф. 164. – Воп. 1. – Спр. 127. Загады Міністэрства культуры БССР, 1964 г.

19. БДАМЛМ. – Ф. 164. – Воп. 1. – Спр. 147. План работы музея на 1966 г.

20. БДАМЛМ. – Ф. 164. – Воп. 1. – Спр. 148. Пратаколы пасяджэнняў Навуковай рады за 1966 г.

21. БДАМЛМ. – Ф. 164. – Воп. 1. – Спр. 153. Справаздача аб дзейнасці музея за 1966 г.

22. БДАМЛМ. – Ф. 164. – Воп. 1. – Спр. 159. Загады і пастановы МК СССР і МК БССР аб дзейнасці музеяў за 1968 г.

23. БДАМЛМ. – Ф. 164. – Воп. 1. – Спр. 167. Перапіска з МК БССР па пытаннях арганізацыі выставак і выдання каталогаў за 1968 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

24. БДАМЛМ. – Ф. 164. – Воп. 1. – Спр. 174. Справаздача аб рабоце музея за 1969 г.

25. БДАМЛМ. – Ф. 164. – Воп. 1. – Спр. 177. Перапіска з арганізацыямі і прыватнымі асобамі аб арганізацыі выставак, набыцці карцін за 1969 г.

26. БДАМЛМ. – Ф. 164. – Воп. 1. – Спр. 179. Загады дырэктара музея па асноўнай дзейнасці.

27. БДАМЛМ. – Ф. 164. – Воп. 1. – Спр. 182. Справаздача аб рабоце музея за 1970 г.

28. БДАМЛМ. – Ф. 164. – Воп. 1. – Спр. 183. Статыстычная справаздача аб колькасці адміністрацыйна-кіруючага персаналу і размеркаванні ўсіх работнікаў па пасадах за 1970 г.

29. БДАМЛМ. – Ф. 164. – Воп. 1. – Спр. 185. Перапіска з арганізацыямі і прыватнымі асобамі аб арганізацыі выставак, набыцці карцін за 1970 г.

30. БДАМЛМ. – Ф. 164. – Воп. 1. – Спр. 193. Перапіска па пытаннях арганізацыі выставак і камплектавання за 1970 г.

31. БДАМЛМ. – Ф. 164. – Воп. 1. – Спр. 199. Справаздача музея за 1972 г.

32. БДАМЛМ. – Ф. 164. – Воп. 1. – Спр. 214. Пратаколы пасяджэнняў Навуковай рады за 1974 г.

33. БДАМЛМ. – Ф. 164. – Воп. 1. – Спр. 217. Справаздача аб рабоце музея за 1974 г.

34. БДАМЛМ. – Ф. 164. – Воп. 1. – Спр. 260. Справаздача аб рабоце музея, 1977 г.

35. БДАМЛМ. – Ф. 164. – Воп. 1. – Спр. 267. Загады Міністэрства культуры БССР, 1979 г.

36. БДАМЛМ. – Ф. 164. – Воп. 1. – Спр. 269. Справаздача аб рабоце музея за 1979 г.

37. БДАМЛМ. – Ф. 164. – Воп. 1. – Спр. 279. Перапіска з Міністэрствам культуры БССР за 1980 г.

38. БДАМЛМ. – Ф. 164. – Воп. 1. – Спр. 294. Перапіска з МК СССР і МК БССР і музеямі па асноўнай дзейнасці.

39. БДАМЛМ. – Ф. 164. – Воп. 1. – Спр. 297. Справаздачы аб рабоце музея, 1984 г.

*40. Запартыка, Г. В.* Матэрыялы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь у фондах Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва / Г. В. Запартыка // Музей XXI стагоддзя : актуальныя праблемы дзейнасці : навук.-практ. канф., прысвечаная 65-годдзю з дня заснавання Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, Мінск, 9–11 лістап. 2004 г. / [навук. рэд. Н. М. Усава]. – Мінск : Белпрынт, 2008. – С. 133–139.

*41.* Елена Аладова. Музей – ее судьба : воспоминания, документы, исследования / [авт. концепции и сост.: Б. Крепак, В. Прокопцов, Н. Усова]. – Минск : Мастац. літ., 2006. – 318, [1] с.

*42.* Фондавая работа в музее // Российская музейная энциклопедия [Электронный ресурс]. – 2002. – Режим доступа: http://www.museum.ru/rme/mb_fonds.asp. – Дата доступа: 09.04.2013.

*43. Юренева, Т. Ю.* Музееведение : учебник / Т. Ю. Юренева. – М. : Акад. проект, 2003. – 558 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*I. BAMBESHKO, A. PAVLOVA*

**SCIENTIFIC-RESEARCH ACTIVITIES
OF THE NATIONAL MUSEUM OF FINE ARTS IN 1944–1984**

*The article deals with such sphere of culture history as the scientific-research activities of the BSSR State Museum of Fine Arts, which hasn't been researched thoroughly by the Belarusian historians yet. Chronologically the article embraces the period from 1944 up to 1984. On the bases of archival sources the authors give some characteristics of documentation about the acquisition, scientific processing and preservation of the museum collections. The comparative analysis of each decade is given and the main problems of every aspect of the acquisition and scientific work are determined.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 11.04.2013.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ